How[illegible] the current US President is [illegible]onald Reagan. So, as he welcomes Mikhail Gorbachev on the [illegible] before the White House, [illegible] points out that a strange[illegible] a friend to make acquaintance with. Trumpets are blown, s[illegible]iers march past. There are [illegible]s and handshakes. Then the[illegible] is more waiting.

Just like it was in Reykjavik. The negotiations were being dragged out on that last day. Press people were crowded round a giant TV screen. They were waiting for good news. TV cameras were aimed at the house where the talks were being held. The doors remained closed for an hour, for two hours, for three hours... Suddenly, the people who had decided to relax and sit back jumped up and made for the TV screen.

Reagan and Gorbachev emerged. They were seen in the distance as silhouettes making for their cars, their faces not discernible. The picture abruptly switched to a closeup. All people watching the screen sighed, or was it a cry? All seemed to shrink back from the screen. We saw the faces of Gorbachev and Reagan. There were press conferences later on; there were books and articles explaining the failure to reach an agreement in Reykjavik. However, at first, there were the faces which told us everything, the faces of two infinitely pained men who seemed to accumulate every grief of the contemporary world.

Gorbachev had said in the Eeast Room of the White House, before he signed the Treaty: "May December 8, 1987, become a date that will be inscribed in the history books, a date that will mark the watershed separating the era of mounting risk of nuclear war from the era of the demilitarization of human life".

A year ago, at Reykjavik, it seemed possible to do away with all nuclear weapons at one sweep. However, humankind always does only what it is ready to do. Today, it is eliminating intermediate- and shorter-range nuclear missiles. Tomorrow, it will take the next step forward.

Yegor YAKOVLEV.

FOR CHILDREN

One hundred and twenty-five million roubles have been remitted to A/C No. 707 of the Soviet Children's Fund named after V. I. Lenin. Not a single rouble from this sum will be spent on the maintenance of the apparatus — this was said on the eve of the Fund's constituent conference by the chairman of its Organizing Committee, writer Albert Likhanov.

EIGHT HUNDRED delegates — teachers and former wards of children's homes, writers, physicians, parents of many children — arrived in Moscow to take part in the conference. They came from different parts of the country to discuss what cannot but be a source of concern — how to turn the money of the Fund into warmth for those who need help most of all.

For too long a time the screen of cut and dried phrases about childhood being a happy time used to hide the unfavourable situation in the health care system for children, the conventionalism of children's homes which did not become a real home for many of the 300,000 of their wards, and the glaring indifference towards teenagers who have stumbled and cannot, by themselves, find a way to us, favourable ones. Like many problems in our life, they have been engendered not so much by economic difficulties as by egoism, alienation and social apathy.

The Children's Fund sees the solution of the most painful and urgent problems existing today as the priority direction of its activities.

GEOCHEMICAL MAP OF MINSK ISSUED

The Byelorussian Academy of Sciences' Institute of Geochemistry and Geophysics has handed over to the Executive Committee of the Minsk City Soviet (Counci) a geochemical map. It was compiled on the basis of soil, plant, snow and watertests to determine the content of heavy metals and toxic compounds, as well as detect the first symptoms of air pollution.

The results of scientists' research were applied by the Minskproekt Design Institute in planning Minsk's development for the period ending in the year 2000.

Geochemical maps drawn for other cities of the Republic make it possible to establish what organizations must enhance their environmental safety measures, where arboriculturists' effort is needed, where new kindergartens or hospitals should be located, and where the polluted soil must be removed.

BYELORUSSIAN MAMMALOGY SOCIETY

A Byelorussian branch of the All-Union Mammalogy Society has been set up, with the Byelorussian Zoology Institute as its main sponsor. The society's purpose is to pool the efforts of the staffs of research institutions, institutions of higher learning, environmental organizations and game preserves to solve the urgent problems of protection of mammals. At the constituent meeting the society members learnt of the more significant research papers by Byelorussian mammalogists, and endorsed a plan of action.

ІНТЭРВ'Ю З СЫНАМ СЛАВУТАГА ПІСЬМЕННІКА

ДРУГОГА ЛЁСУ НЕ ХАЧУ

«Інтэлігенцыя і рэвалюцыя»—гэтай няпростай тэме прысвечаны многія раманы, фільмы савецкага часу. «Прымаць ці не прымаць?»—такое пытанне вырашалі ў 1917 годзе тысячы вучоных, мастакоў, інжынераў. Для многіх яно вызначылася праз «блуканне па пакутах». Іншыя прынялі рэвалюцыю адразу і назаўсёды.

Прафесар фізічнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Мікіта Талстой—нашчадак старажытнага рускага роду, сын славутага савецкага пісьменніка Аляксея Талстога, нарадзіўся ў 1917 годзе. Яго памяць захавала многія непаўторныя рысы эпохі.

МЫ ГУТАРЫМ дома ў Мікіты Талстога. У прасторнай кватэры на набярэжнай Карпаўкі няма паліраваных сценак, зззяючага хрусталю і іншых атрыбутаў дастатку. Гаспадар частуе кавай. Што яшчэ трэба для добрай размовы?

— Нарадзіўся я ў лютым 1917-га, так што ў кастрычніку мяне адлучылі ад матчынага малака і ад графскага тытула. Першае я перанёс цяжка, другое, як гавораць, зусім спакойна...

Нарадзіўся ў Маскве, у самым цэнтры, у адным з арбацкіх завулкаў. Час быў трывожны. Калі прыйшла пара мне з'явіцца на свет, рамізнікаў у горадзе не было. Дасталі дзіцячыя санкі (добра, што мама, вядомая тады паэтэса Наталля Крандзіеўская, была невысокага росту), і бацька разам са сваім сябрам мастаком Максам Валошыным, жартуючы, павезлі яе па заснежаных вуліцах у клініку, дзе я і нарадзіўся па старому стылю ў ноч з 13-га на 14-е. Забабоны, якія падтрымала акушэрка, адыгралі ролю. Маму ўгаворвалі: «Пацярпіце, пацярпіце». І ці то мама паслухалася, ці то я замарудзіў, але 13, ракавое чысло, мы мінулі.

У 1918 годзе бацька паехаў з літаратурнымі канцэртамі да Чорнага мора з усёй сям'ёй: я—аднагадовы і старэйшы брат. Па расказах мамы, я не выпускаў з рук сваю галоўную «каштоўнасць»—бутэлечку з мухамі, закрытую коркам. На поўдні нас застала наступленне банд атамана Грыгор'ева. Гэта была анархічная вольніца з лозунгамі тыпу «За бальшавікоў, супраць камуністаў». Майму бацьку—графу—таксама пагражала «сценка». З Адэсы мы паехалі за мяжу. Спачатку ў Стамбул, а потым у Францыю. Гэты цяжкі перыяд жыцця бацька апісаў у аповесці «Прыгоды Няўзорава, ці Ібікус». Дзяцінства маё да шасці год праходзіла ў Парыжы, а потым у Берліне. Хоць гэта было вельмі даўно, але, бываючы ў навуковых камандзіроўках у Францыі ці ГДР, успамінаю асобныя эпізоды так ярка, нібыта яны асвятляюцца ўспышкай маланкі.

У 1923 годзе мы вярнуліся ў Петраград,—працягвае мой субяседнік.—На параходзе са Штэціна.

Вяртаюся да пачатку майго жыцця. Пасля прыезду на Радзіму мы жылі ў Петраградзе, а потым пераехалі ў Царскае Сяло. Многа цікавага прайшло перад вачыма. Я быў, як кажуць, з маладых ды ранніх: не толькі шмат бачыў, але ўжо і разумеў. Добра помню перыяд нэпа, адценні таго жыцця. У мяне гэты час праламляўся праз літаратуру—у доме бацькі бывалі многія пісьменнікі, паэты. Рэвалюцыя так глыбока перавярнула пласты грамадства, што вылезлі і чэрві, і ўсякае смецце з магутнага і ўрадлівага чарназёму.

Але галоўным у тыя гады для мяне было абуджэнне страсці да навукі, да дакладных ведаў. Тое, што для майго бацькі назаўсёды засталося марай. У яго творах таго часу «Аэліта», «Гіпербалоідзе інжынера Гарына»—мары пра космас, пра палёт на Марс, пра стварэнне грозных прамянёў былі толькі рамантычнай навуковай фантастыкай. Бацька не скончыў тэхналагічны інстытут, а сваю любоў да навукі перанёс на вучоных, даследчыкаў, лётчыкаў. Многія з іх бывалі ў нашым доме. Бацька іх літаральна абажаў.

Яны зрабілі ўплыў і на мой лёс. Я слухаў раскрыўшы рот размовы і спрэчкі пра шляхі рускай навукі. Павінен сказаць, што эпоха 20-х—30-х гадоў характарызавалася нейкай незвычайнай узбуджанасцю, насычанасцю, энтузіязмам маладых. Асабліва ў тэхніцы і навуцы. Небывалыя праекты, прага раскрыцця тайн прыроды разпораз нараджаліся ў гарачых галовах.

Я здаваў экзамены на фізічны факультэт універсітэта, дзе было 12 ча[illegible]ек на месца. Помню, як [illegible]саў вялікае сачыненне, праўда, без знакаў прыпынку. Вырашыў, што потым іх рас[illegible]ю, ну і забыўся... Не хап[illegible] 42 коскі. Выратаваў ра[illegible] добры змест — мне паставілі ўсё ж здавальняюча. Ас[illegible]я экзамены я здаў на «[illegible]тна» і стаў студэнтам.

Кастрычніцкая рэвалюцыя прывяла да злому звыклых паняццяў таксама ў навуцы і тэхніцы. Яна паслужыла як бы працягам думак і надзей лепшых розумаў краіны. Індустрыялізацыя, якая тады стала на чаргу як глабальная задача, не была штучна «прыўнесена» ў грамадства якімсьці дэкрэтам ці па чыймусьці жаданню. Яе можна параўнаць з доўгачаканай жыватворнай вільгаццю, што напаіла ўдзячную глебу. У Расіі, жудасна разбуранай войнамі, тым не менш жылі і тварылі І. Паўлаў, М. Бонч-Бруевіч, Л. Арбелі.

Нельга скідваць з рахунку тое, што пасля рэвалюцыі большая частка інтэлігенцыі засталася ў Расіі і служыла Савецкай уладзе: амаль усе вядомыя філолагі засталіся тут, амаль усе матэматыкі, а фізікі нават без «амаль».

У валёнках і рукавіцах, у халодных аўдыторыях яны чыталі лекцыі студэнтам. Мост паміж старой і новай культурай захаваўся. У гэтым адбілася найвялікшая заслуга Леніна і яго саратнікаў. Калі б не было гэтага, невядома, колькі часу мы даганялі б перадавыя краіны. Нас вучылі квантавай механіцы людзі, якія стваралі яе амаль што на нашых вачах: акадэмікі У. Фок, А. Іофэ.

У нашым доме бывалі П. Капіца, М. Вавілаў—мне пашанцавала, як нікому ў жыцці. Надоўга атрымаў я ад іх тады зарад патрыятызму. Я ведаю, што, калі бацьку маёй жонкі, Міхаілу Лазінскаму, бліскучаму філолагу, паліглоту, перакладчыку, прапанавалі адразу пасля рэвалюцыі кафедру ў Страсбургскім універсітэце, ён заявіў: «Калі ў Расіі, на Радзіме, цяжка, сумленны чалавек яе не пакідае».

— Ці можна сказаць, што зрабіла вас вядомым фізікам рэвалюцыя?..

— Так, зразумела. Інакш, думаю, жыццё маё склалася б зусім па-іншаму. Хутчэй за ўсё, я б заняўся мовамі, стаў бы дыпламатам... Атмасфера ў Расіі, рэвалюцыйны ўздым адыгралі вялікую ролю ў выбары прафесіі для многіх. Рэвалюцыя нібыта зняла ланцугі з гіганцкай тоўшчы народнай, змяла саслоўныя перагародкі і адкрыла дзверы да ведаў, да творчасці. Не выпадкова ў першыя ж гады пасля Кастрычніка з'явілася столькі самародкаў—«чырвоных дырэктароў», «чырвоных дыпламатаў», таленавітых военачальнікаў.

— І ўсё-такі, ці зрабіла ўплыў тое, што вы выйшлі з дваранскага асяроддзя, на ваш светапогляд, на вашу кар'еру?

— Я з'яўляюся своеасаблівым «мосцікам» ад таго пакалення, якое мяне выгадавала, да будучага, да тых самых студэнтаў, якіх я сам вучу ўжо 45 год. Я вырас і сфарміраваўся пры Савецкай уладзе. Але, натуральна, увабраў у сябе многае з мінулага. Напрыклад, гуманізм, пакланенне перад духоўным пачаткамі, гумар, нарэшце. З дзяцінства ў мяне выхавалі павагу да чалавечага генія, таленту. Навучылі адчуваць водападзел паміж пошлым і сапраўдным. Я абавязаны перадаць гэта сваім студэнтам і ўвогуле маладым. Я бачу, з якой прагнай цікавасцю яны ўспрымаюць мае расказы аб рускай культуры, якія я «дабаўляю» да сваіх лекцый па фізіцы.

Маладосць прагная і часам неразборлівая. Так што проста неабходна засцерагчы моладзь ад уяўных каштоўнасцей, якія нясе ў сабе, скажам, спажывецтва. Ленін пакінуў моладзі запавет вучыцца. У свае 70 год я разумею яго ў трох іпастасях: чалавек павінен у жыцці пабываць вучнем—вучоным—настаўнікам.

— Ці задаволены вы сваім лёсам?

— Так, я шчаслівы, што жыву ў Савецкай краіне, дзе Рэвалюцыя максімальна поўна дапамагла збыцца надзеям мільёнаў маіх суайчыннікаў. Цяпер у краіне ідзе перабудова. І, ведаеце, яна ў многім нагадвае мае гады маладосці, калі з незвычайнай сілай раскрывалася энергія людзей. Таму што менавіта такі рэвалюцыйны выбух і неабходны для пераадолення застою, раўнадушша ўсюды: у навуцы, у прамысловасці, у чалавечых адносінах.

Каб уявіць той грандыёзны шлях, які прайшла наша краіна, прывяду толькі адзін прыклад. Аляксей Талстой напісаў фантастычны раман «Гіпербалоід інжынера Гарына». Мой сын, яго ўнук, займаецца тым самым фантастычным лазерам, які стаў рэальнасцю нашых дзён. Як фізік, я разумею ўсю сілу атама, і мара мая, каб служыў ён дабру, а не гібелі чалавецтва.

Ала БЕЛЯКОВА.

КАМПАЗІТАР АЛЕГ ЗАЛЁТНЕЎ: «Я ВЕРУ Ў РЭНЕСАНС КЛАСІКІ»

ДУХОЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ



Яго [illegible]цёвы шлях у нейкай ступен[illegible] [illegible]ызначылі бацькі. Яны аддалі свайго сына ў музычную школу. Але настаўнікі не былі ў захапленні ад Алега Залётнева: хлопчык не надта паслухмяны, увесь час малюе ў нотным сшытку. «Вашаму сыну трэба вучыцца на мастака», — параілі яны бацьку. А ў агульнаадукацыйнай школе не сумняваліся, што Алег, як і бацька, будзе артыстам — недарэмна ж займаецца ў дзіцячай драматычнай студыі. Нельга сказаць, што Алега лічылі няздольным, але ў музычным вучылішчы, куды ён паступіў на тэарэтычны факультэт, студэнту карэктна растлумачылі, што кампазітара з яго не будзе. І рэкамендацыю для паступлення ў кансерваторыю не далі.

Нямала вады, як кажуць, сплыло з таго часу. «Бесперспектыўны» студэнт — сёння вядомы і аўтарытэтны кампазітар. 40-гадовы Алег Залётнеў — аўтар музыкі да шматлікіх тэатральных і радыёспектакляў, тэле- і кінафільмаў. Выконваюцца яго Камерная сімфонія і Струнны квартэт, Фартэпіянны канцэрт і паэма-карціна для аркестра беларускіх народных інструментаў «Купальская ноч». У рэпертуары Мінскага камернага аркестра — Адажыо для струнных інструментаў (яно разам з Такатай запісана на пласцінку).

Адзін з апошніх, найбольш значных, этапных, як гавораць спецыялісты, твораў Алега Залётнева — драматычная араторыя «Лісткі календара» на вершы М. Танка для салістаў, хору і сімфанічнага аркестра. Яе тэкставая аснова — успаміны і вершы розных гадоў Максіма Танка. Галоўны герой араторыі — Паэт, які імкнецца асэнсаваць лёс свайго народа, яго мінулае і цяперашні час, убачыць будучыню. У дзевяці частках араторыі прадстаўлены розныя старонкі жыцця — лірычныя і драматычныя, трагічныя і шчаслівыя. Цэнтральнае месца ў яе драматургіі займае сцэна з паэмы М. Танка «Кастусь Каліноўскі». Араторыя ўпершыню была выканана сёлета ў канцэрце на адкрыцці фестывалю мастацтваў «Мінская вясна».

— Напісана цудоўная музыка, — сказаў пасля прэм'еры народны артыст СССР Яўген Глебаў. — Хочацца адзначыць арыгінальнасць задумы. Твор нацыянальны не толькі па тэме, але і па духу: бачыш фарбы, адчуваеш пахі нашай зямлі...

— Араторыя вырасла на глебе нацыянальных традыцый, і ў той жа час у ёй многа ўласных знаходак, — адзначыла музыказнавец Вольга Савіцкая. — Да іх можна аднесці і арганічнае ўвядзенне ў яе тканіну голасу самога паэта. Даволі нечаканым і цікавым аказаўся тут гэты публіцыстычны прыём. Арыгінальнае аркестравае вырашэнне араторыі. Я маю на ўвазе выкарыстанне аўтарам у сімфанічнай музыцы народных фальклорных інструментаў: альтовых цымбалаў, дудкі, жалейкі. Гэта значна ўзбагаціла музычную палітру твора.

Метамарфозы нярэдкія наогул у жыцці, скажа чытач. І прыгадае казку пра брыдкае качаня, якое стала прыгожым лебедзем. Але ў нашым выпадку метамарфозы не адбылося. Проста хлопчык аказаўся з характарам, асобай са сваім бачаннем свету і разуменнем свайго месца ў жыцці. Насуперак усім прагнозам і перашкодам ён ажыццявіў сваю мару.

— Я сапраўды не з тых людзей, каму ва ўсіх справах — зялёнае святло, — згаджаецца Алег. — Не хадзіў у любімчыках ні ў школе, ні потым у кансерваторыі. Можа быць, ад таго, што настаўнікі і педагогі не ведалі, чаго ад мяне чакаць. Ды я і сам тады не разумеў, на што здольны. Маляваў, іграў у спектаклях, вучыўся музыцы. Шукаў, можна сказаць, сябе.

Давялося працаваць у розных месцах — у Маладзечан-

скім музвучылішчы, у тэатрах, у музычных школах. У 1984 годзе скончыў асістэнтуру ў Беларускай кансерваторыі. Вось так па часе расцягнулася мая адукацыя. Але я не шкадую, што мой шлях да прафесіі быў не такі роўны і бесканфліктны, як у некаторых.

Лічу, што пашчасціла на сустрэчы з цікавымі і таленавітымі людзьмі. Некаторыя з іх, як, напрыклад, Уладзімір Пузыня, аказалі даволі моцны ўплыў. Дзякуючы яму, я душой адчуў фальклор. Пазнаёміліся мы ў музычнай школе, дзе я вёў кампазітарскі гурток. А ў Пузыні ў гэтай школе была майстэрня, ён вырабляў там старадаўнія беларускія інструменты. Слухаў я іх першабытныя гукі, і ўва мне нібы абуджаўся голас далёкіх продкаў.

А яшчэ адным арыенцірам быў Уладзімір Караткевіч, хаця з ім давялося сустрэцца толькі аднойчы. Мне, як і многім іншым, гэты самабытны пісьменнік дапамог сваімі творамі лепш зразумець Беларусь, яе гісторыю, яе народ, усвядоміць сябе яго часткай.

Вынікам сяброўства і супрацоўніцтва Залётнева з Пузынём стаў ансамбль фальклорных інструментаў, які быў арганізаваны ў школе. Спецыяльна для гэтага калектыву яго кіраўнік А. Залётнеў напісаў п'есу «На Купалле».

Чарговую нялёгкую задачу паставіў перад сабой малады кампазітар, калі ўзяўся пісаць музыку да першага радыёспектакля паводле аповесці Караткевіча «Паром на бурнай рацэ» і затым па раману «Каласы пад сярпом тваім». У гэтых работах вельмі ярка праявіўся прафесіяналізм і універсальны характар таленту А. Залётнева, які лёгка і арганічна аб'ядноўвае ў адной рабоце полістылістычныя пласты.

— Усё гэта даў мне тэатр, — расказвае Алег. — Ён быў і застаецца для мяне крыніцай духоўнасці. Яшчэ ў час занятkaў у тэатральнай студыі «Юнацтва» я паспрабаваў пісаць музыку. Менавіта тут з'явілася думка стаць кампазітарам.

Сапраўды, вельмі многае звязвае яго з тэатрам. «Алегу, майму дарагому выхаванцу, таленавітаму артысту, музыканту, кампазітару, які аформіў музыкай многія спектаклі калектыву». Такія словы напісала на тэатральнай праграмцы ў дзень прэм'еры рэжысёр вядомай і папулярнай у свой час дзіцячай драматычнай студыі Палаца культуры Белсаўпрофа Ніна Фурэн, дзе некалі займаўся Алег. А потым была маладзёжная студыя «Юнацтва». Яна, як прыгадвае Алег, была для яе ўдзельнікаў своеасаблівым гуртком самаадукацыі і самараскрыцця. Пазней некалькі чалавек з гэтай студыі, ужо прафесійныя артысты, арганізавалі свой літаратурны тэатр. Ставілі кампазіцыі паводле твораў Купалы, Хлебнікава, Дастаеўскага, Танка, Багдановіча. Алег Залётнеў пісаў для тых інсцэніровак музыку. Дарэчы, у аснову араторыі «Лісткі календара» была пакладзена літаратурная кампазіцыя, падрыхтаваная некалі іх калектывам. А цяпер энтузіясты збіраюцца зрабіць літаратурную кампазіцыю паводле паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра».

— Менавіта тэатр, — працягвае Алег, — сфарміраваў мяне як кампазітара. Я не агаварыўся. У тэатры ўвесь час розныя спектаклі, таму трэба ўмець хутка мабілізавацца, перабудавацца, памяняць почырк, стыль. Быць кожны раз непазнавальна новым, непрадказальным значна цяжэй, чым эксплуатаваць аднойчы знойдзенае. У кампазітарскім асяроддзі яшчэ існуюць адносіны да тэатральнай музыкі як да нечага другараднага, утылітарнага. Але гэта далёка не так.

Тыя, каму даводзілася працаваць або сутыкацца па справах з Алегам Залётневым, адзначаюць яго грунтоўнасць ва ўсім. Не спяшаючыся, добра падрыхтаваўшыся (вялізны пісьмовы стол у рабочым кабінеце кампазітара завалены кнігамі, часопісамі, партытурамі, зроблены выпіскі на асобных аркушах) і абдумаўшы ўсе дэталі будучага твора, ён садзіцца за інструмент. Цішыня і поўная сканцэнтраванасць. Бывае, што дотык да клавішаў, гучанне старога раяля настройваюць на адпаведны лад, калі лёгка пішацца музыка.

Па натуры Алег вельмі цэльны, дзейны і энергічны чалавек, жыва цікавіцца літаратурай, рознымі відамі мастацтва. Няўдачы, зразумела, не натхняюць, але поспехі не кружаць галавы. Няма ў яго і «комплексу геніяльнасці», калі ўласная асоба здаецца самай значнай у свеце. Арганічны стан для яго — незадаволенасць і пастаянны пошук.

— Калі творчы чалавек самазаспакоіўся, ён памёр для мастацтва, — лічыць А. Залётнеў. — І будучыні ў яго няма. Да слова сказаць, я не ведаю дакладна, што напішу заўтра. Не люблю, калі прыклейваюць ярлыкі, скажам, «кампазітар-песеннік» ці «тэатральны кампазітар». Прафесійны кампазітар павінен пісаць усё, а не замыкацца на нейкай сваёй дзялянцы. Хочацца напісаць і сімфонію, і балет... Мне бачыцца сімфонія, і я дакладна ведаю, што там будзе частка — «Апакаліпсіс». Чым гэта навеяна? Трагедыяй Чарнобыля, пастаяннай пагрозай атамнай вайны ў свеце, трывогай за будучыню дзяцей, прадчуваннем катастрофы, якая можа спасцігнуць чалавецтва, калі яно будзе ісці на повадзе масавай культуры.

Нядаўна ў біяграфіі Алега Залётнева скончыўся непрацяглы перыяд, калі бы[illegible]роста «вольным мастаком». [illegible]зноў звёў яго з тэатрам. Ц[illegible]ер ён пры пасадзе: загадчык музычнай часткі Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра БССР. [illegible]очацца актыўна ўдзельнічаць у грамадскіх справах, ад кожнага чалавека, калі ён н[illegible]эўнадушны, мне здаецца, [illegible]сама нешта залежыць», — тлумачыць кампазітар сваю пазіцыю.

Што яго асабліва хвалюе?

— Што можа быць агідней бездухоўнасці? — адказвае пытаннем на пытанне. — Мастацтва, як гэта ні горка, у многім згубіла свой аўтарытэт. Адну з прычын гэтага я бачу ў тым, што яно адарвалася ад жыцця. Стала існаваць само для сябе. Атрымалася дзіўная і ненатуральная сітуацыя: мастакі пішуць для мастакоў, акцёры іграюць для акцёраў, музыканты — для музыкантаў. Праўда, цяпер многае мяняецца, але шэрасць, кан'юнктуршчына ў мастацтве не так лёгка здаюць свае пазіцыі.

Работы ў дзеячаў мастацтва і культуры непачаты край. Самы час заняцца элементарным асветніцтвам у масах. Думаю, што новая перадача «Беларускія кампазітары дзецям», прэм'ера якой нядаўна адбылася (я яе «хросны бацька» і вядучы) будзе карыснай для юных, дапаможа ім лепш арыентавацца ў свеце музыкі. Мне здаецца, што падобныя тэле- і радыёперадачы павінны існаваць і для дарослых. Бо захапленне моладзі толькі рокам і поўнае непрыняцце іншай музыкі — гэта не проста даніна модзе, але і элементарная неразвітасць, абмежаванасць густаў. А густы трэба выхоўваць. Я з аптымізмам гляджу ў будучыню і таму веру ў рэнесанс класікі.

Цяпер А. Залётнеў жыве па строгаму раскладу. Спраў прыбавілася, а паспець зрабіць трэба многае: падрыхтавацца да лекцый у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце, дзе ён чытае курс «Работа рэжысёра з кампазітарам», запісаць перадачу на радыё, схадзіць на канцэрт у філармонію, на рэпетыцыю ў тэатр, на кінастудыю... У імклівых буднях сучаснасці нараджаецца яго музыка.

Таццяна АНТОНАВА.

ЧАРГОВАЕ ВЫДАННЕ СЛАВІСТЫЧНАГА ЦЭНТРА Ў ПРАЗЕ

ФОНД АЛЯКСАНДРА СМІРДЗІНА

У славянскім свеце за пасляваенныя дзесяцігоддзі надзвычай шырокую папулярнасць набыла «Слованска кнігоўня» — адна з буйнейшых спецыялізаваных чэшскіх навуковых бібліятэк, што месціцца ў старажытнай дзяльніцы Прагі пад лаканічнай назвай «Старэ Место». У яе надзвычай багатых фондах захоўваецца літаратура пра гісторыю і культуру ўсіх славянскіх народаў. Кожны з славістаў любой краіны, які прыязджаў у Прагу, заўжды імкнуўся пабываць у гэтай унікальнай культурнай установе. Яшчэ ў 20-я гады Славянскую бібліятэку наведалі акадэмік Я. Карскі, рэктар Беларускага універсітэта У. Пічэта, вядомы педагог і літаратар І. Дварчанін, паэт У. Жылка. Дарэчы, ужо ў тыя часы невялікі калектыў «Слованскай кнігоўні» наладзіў сувязі з Інстытутам беларускай культуры, Беларускай дзяржаўнай бібліятэкай у Мінску і Беларускім навуковым таварыствам у Вільні. У нашы дні сувязі Славянскай бібліятэкі і яе буйнейшага бібліяграфічнага цэнтра славістыкі з навуковымі гуманітарнымі ўстановамі і бібліятэкамі значна пашырыліся.

Увагу беларускіх навукоўцаў Славянская кнігоўня прыцягвае не толькі сваімі багатымі і рэдкімі фондамі, але і тым, што з'яўляецца буйнейшым выдавецкім цэнтрам па выпуску славістычнай літаратуры і бібліяграфічных даведнікаў, што тут кожны год арганізуецца каля сарака ілюстрацыйна-кніжных выставак, звязаных з юбілейнымі і памятнымі датамі ў галіне славістыкі. Да таго ж па даручэнню Міжнароднага камітэта славістаў, які перыядычна праводзіць з'езды вучоных, Славянскай бібліятэцы даручана выдаваць бібліяграфічныя даведнікі гэтых важных мерапрыемстваў. Апрача гэтага, яна выпускае выданні, задача якіх прапагандаваць уласныя бібліятэчныя фонды. Да ліку найбольш значных выданняў трэба аднесці бібліяграфічны слоўнік «Чэхаславацкія працы аб мовах, гісторыі і культуры славянскіх народаў пачынаючы з 1760 года» (1972), які падрыхтаваны сумесна з Дзяржаўнай бібліятэкай ЧССР і Чэхаславацкім інстытутам Чэхаславацкай Акадэміі навук, зборнік артыкулаў па пытаннях гісторыі чэшска-рускіх культурных узаемасувязей (1976), кнігу М. Поглеёвай «Чэшска-польскія літаратурныя сувязі ў 1945—1979 гадах» (1980), працу Францішкі Сакаловай «Кірылічныя выданні славянскіх народаў» (1982), «Ленініяна ў Славянскай кнігоўні» — бібліяграфічны даведнік рэдкіх прыжыццёвых прац У. І. Леніна, якія выдадзены да 1923 года і захоўваюцца ў бібліятэцы (1984), зборнік прац «Славянскія літаратуры» (1984) і іншыя кнігі.

З апошніх выданняў гэтага славістычнага цэнтра прыцягвае ўвагу кніга Льва Кішкіна «Да гісторыі Смірдзінскага фонду Славянскай бібліятэкі» (1987). Аляксандр Смірдзін (1795—1857) — вядомы рускі публіцыст, кнігавыдавец, уладальнік літаратурнага салона, «Бібліятэкі для чытання» і кніжнай лаўкі ў Пецярбургу. Яго літаратурны салон і багатая бібліятэка адыгралі выдатную ролю ў развіцці тагачаснага культурнага жыцця ў Расіі. Варта прыгадаць, што кнігамі Аляксандра Смірдзіна карысталіся В. Жукоўскі, І. Крылоў, А. Пушкін, М. Гогаль, П. Вяземскі, А. Герцэн, Ф. Дастаеўскі і многія іншыя вядомыя літаратары Расіі. З нашых землякоў паслугамі «Бібліятэкі для чытання» карысталіся паэты Адам Міцкевіч (1798—1855), Ян Баршчэўскі (1790—1851) і мастак-жывапісец, член Імператарскай акадэміі мастацтваў Іосіф Аляшкевіч (1777—1830). Такім чынам, гэтага «высакароднага кніжніка» (словы А. Пушкіна), гасцінна[illegible] і сардэчнасцю якога кар[illegible]таліся многія выдатныя людзі таго часу, ведалі ў м[illegible]х кутках Расіі. З прычыны[illegible]гага яго бібліятэка яшчэ[illegible] жыцці стала своеасаб[illegible]м культурным і гістарычным помнікам. Трэба ўлічваць [illegible]о, апрача кніг рускіх а[illegible]раў, тут былі пераклады на рускую мову твораў Ф. Петраркі, Э. Ратэрдамскага, Гарацыя, Мантэск'е, Вальтэра, Русо, Дзідро, Лесінга, Шылера, Гётэ і многіх іншых выдатных прадстаўнікоў еўрапеўскіх літаратур. Смірдзінская бібліятэка існавала і пасля смерці яе гаспадара аж да 1864 года, а затым пачалася распрадажа... У 1886 годзе стала вядома, што славутую Смірдзінскую бібліятэку купіў рыжскі кнігапрадавец Н. Кімель. З заснаваннем Славянскай бібліятэкі ў Празе (1924) яе кіраўніцтва пачало весці камплектаванне спецыяльных фондаў па гісторыі і культуры славянскіх народаў і ў 1932 годзе пасля доўгіх перагавораў купіла кнігі Аляксандра Смірдзіна. Так у Славянскай бібліятэцы апынуўся Смірдзінскі фонд у колькасці 12 938 тамоў.

У змястоўнай і цікавай кнізе Льва Кішкіна «Да гісторыі Смірдзінскага фонду Славянскай бібліятэкі» раскрываюцца гады станаўлення светапогляду публіцыста Аляксандра Смірдзіна, дзякуючы якому простыя людзі Расіі атрымалі магчымасць купляць недарагія кнігі рускіх і замежных пісьменнікаў. Жыва прадстаўлены тут пачатак выдавецкай і асветніцкай дзейнасці А. Смірдзіна, яго сустрэчы і цеснае супрацоўніцтва з Аляксандрам Пушкіным і іншымі славутымі рускімі літаратарамі і работнікамі культуры той пары. Свае разважанні аўтар умела ілюструе паэтычнымі партрэтнымі замалёўкамі вядомых людзей. Лепшыя літаратурныя сілы Расіі лічылі Аляксандра Смірдзіна выключнай асобай, таму цягнуліся да гэтага чалавека, любілі заходзіць да яго, каб пачуць пра кніжныя навіны, атрымаць бібліяграфічную даведку або купіць новую кнігу. Кнігарня Смірдзіна была тады лепшай у краіне і лічылася, па вызначэнню тагачаснай прэсы, «цэнтрам літаратурнай і разумовай дзейнасці, адкуль густ і веды разліваліся па ўсёй матухне вялікай Расіі». А яшчэ таму, пісалася ў газетах, што над кнігарняй знаходзілася «першая па багаццю і паўнаце» бібліятэка. Аляксандр Смірдзін і яго супрацоўнікі славіліся эрудыцыяй наконт кніжных спраў, мелі патрэбныя бібліяграфічныя матэрыялы. Уладальнік кнігарні з большасцю рускіх літаратараў супрацоўнічаў як выдавец, плаціў ім самыя высокія ганарары. Апрача таго, Смірдзін прыцягваў усіх сваёй дзелавітасцю, дабратой і прастадушнасцю.

У шырокім святле падаецца ў кнізе гісторыя Смірдзінскай бібліятэкі, яе лёс. Выданне ўдала ўзбагачаюць ілюстрацыі, якія дапамагаюць чытачу лепш уявіць асобу Смірдзіна і яго самаахвярную працу на карысць грамадскага і культурнага прагрэсу ў Расіі, а заадно і ва ўсім славянскім свеце.

Выданне кнігі Льва Кішкіна «Да гісторыі Смірдзінскага фонду» пад рэдакцыяй доктара Іржы Вацэка — яшчэ адна прыкметная вяха ў высакароднай дзейнасці калектыву Славянскай бібліятэкі, цікавая старонка ў культурных сувязях братніх славянскіх народаў дзеля іх духоўнага ўзбагачэння.

Леў МІРАЧЫЦКІ.

У Палацы культуры і тэхнікі Мінскага аўтазавода прайшоў творчы вечар вядомага беларускага пісьменніка Мікалая Чаргінца. Пра мужнасць аўтара, пра папулярнасць яго кніг гаварылі драматург Мікалай Матукоўскі, празаік Іван Чыгрынаў, літаратуразнавец Уладзімір Гніламёдаў, народны артыст СССР, кампазітар Ігар Лучанок. Творы яго займальныя, вострасюжэтныя. Пісьменнік даўно працуе ў органах міліцыі. Большасць кніг напісана пра міліцэйскія будні. А нядаўна ўбачыў свет раман «Тайна чорных гор» пра падзеі ў Афганістане, адкуль пісьменнік вярнуўся, прабыўшы там доўгі час у камандзіроўцы.

На вечары гучалі ўрыўкі з твораў М. Чаргінца, выконваліся песні — прафесійных аўтараў і беларускія народныя.

Сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі білетаў на вечар, пералічаны ў Савецкі фонд міру і Савецкі фонд культуры.



НА ЗДЫМКУ: выступае пісьменнік Мікалай ЧАРГІНЕЦ.

К. СЦЕПАНЮК.

Фота У. КРУКА.

ФЛАРЫСТЫКА—АСОБЫ ВІД МАСТАЦТВА

КРУГЛЫ ГОД— ЛЕТА



Выпадковая сустрэча — і душа «ўзята ў палон». Жанчына робіць тое, пра што падсвядома марылася заўсёды,— прадаўжае жыццё хараства. Бачыш кветку, любуешся ёю, а сэрца ўжо пачынае шчымець: прыгажосць гэта такая недаўгавечная, адцвіце — і чакай цэлы год, пакуль убачыш яе зноў.

А вось Лідзія Дземідзенка, мастак-фларыст, умее «затрымліваць імгненне»: кветкі ў яе «цвітуць» круглы год.

Фларыстыка — гэта цэлая навука. І адначасова асобы від мастацтва. Зыходны матэрыял для фларыста — кветкі, трава, кара і лісце дрэў, грыбы... Разнастайнасць расліннага свету дае магчымасць ствараць розныя дэкаратыўныя кампазіцыі, нацюрморты, пейзажы і нават партрэты. Работа мастака-фларыста складаецца з трох этапаў: збор кветак, галінак; апрацоўка і сушка раслін (самая адказная работа) і, нарэшце, афармленне кампазіцыі.

Нібыта ўсё проста. А на справе інакш. Па-першае, далёка не ўсё сабранае ўдаецца засушыць, бывае, што да 80 працэнтаў матэрыялу псуецца. Няпроста падрыхтаваць і фон — часцей гэта ватманская папера. На яе наносіцца колер (у залежнасці ад задумы аўтара), а зрабіць гэта даволі складана: тут неабходны адценні колеру, плаўныя пераходы. Ну і, вядома, трэба мець тонкі густ, каб карціна атрымалася.

Лідзіі Мікалаеўне лягчэй: вока мастака бачыць больш і хутчэй. Калі галінка, травінка на зямлі для нас толькі галінка і травінка, то для яе гэта матэрыял для работы, яна ўжо бачыць іх у гатовай кампазіцыі.

Маляваць любіла з дзяцінства, і былі для гэтага задаткі. Але прафесійным мастаком стаць не давялося: вучылася ў політэхнічным інстытуце, працавала інжынерам на Мінскім трактарным заводзе, потым сям'я, дзеці. Для сябе малявала, калі былі свабодныя хвіліны. На сценах яе кватэры можна ўбачыць карціны, напісаныя алеем, працуе яна і тушшу.

Фларыстыка «зачаравала» яе, калі на выстаўцы ўбачыла работы Зоі Сычовай. Справа гэта тады была ...й, лёгка выклікала цікаў... Захацелася самой заняцца ёю. К гэтаму часу Лідз... Мікалаеўна была ўжо ... пенсіі, таму вольнага ча... пабольшала. Цяпер яна ... ко не ўяўляе свайго жыцц... без фларыстыкі. Чатыры ...ды займаецца яна любім... справай. Гэта чалавек захоплены, энергічны, добразычлівы. Вялікае задавальненне для яе даведацца, што работы яе спадабаліся, людзі зацікавіліся фларыстыкай. Яна ахвотна адклікаецца на любое пытанне. І чуеш: «Заходзьце. Пакажу. Дапамагу. Зробім разам».


Карціны Лідзіі Мікалаеўны дэманструюцца на выстаўках. У яе ёсць дыпломы «Майстар залатыя рукі», граматы, Ганаровыя граматы. Але галоўнае для яе не ўзнагароды, а радасць творчасці, эстэтычная асалода. У час нашай гутаркі яна паўтарыла гэтую фразу некалькі разоў. Памагае ёй у рабоце і тое, што сям'я (муж, двое сыноў, іх жонкі, унукі) падтрымлівае яе захапленне. Лепшы падарунак нявесткам да дня нараджэння, свята — новая карціна. Імі ўпрыгожаны прасторныя кватэры абаіх сыноў. А самыя вялікія карціны, якім цяжка было знайсці месца ў гарадской кватэры, можна ўбачыць на сценах дачы. Усяго мастачкай створана больш за 200 работ. Многія падораны сябрам, знаёмым. Ну і, вядома, вочы разбягаюцца, калі ўваходзіш ва ўтульную двухпакаёвую кватэру, дзе жывуць Лідзія Мікалаеўна і яе муж, таксама пенсіянер.


Лідзія Дземідзенка — член клуба «Прырода і творчасць» пры Доме прыроды, які знаходзіцца ў Троіцкім прадмесці ў Мінску. Тут цудоўная выставачная зала, ёсць магчымасць збірацца для творчых сустрэч, арганізоўваць персанальныя і ўсесаюзныя выстаўкі. Тут заўсёды рады з'яўленню новых членаў клуба.

Ірына КАЗЛОВА.

НА ЗДЫМКАХ: Лідзія ДЗЕМІДЗЕНКА; яе работы «Дзень нараджэння» (алей), «Зіма» (фларыстыка) і «Гора і слёзы Хатыні» (фларыстыка).







З надыходзячым Новым, 1988-м годам, дарагія чытачы! Зычым здароўя, дабрабыту, міру!

«Голас Радзімы»

ФІЛАТЭЛІСТЫЧНЫЯ ВЫСТАЎКІ

«САВЕЦКАЕ ПАЛЕССЕ-87»

Кожная філатэлістычная выстаўка — свята для калекцыянераў. Тая, што ў Магілёве,—свята двайное, таму што выстаўка такога маштабу тут праводзілася ўпершыню. «Савецкае Палессе»—гэта занальныя філатэлістычныя выстаўкі, якія праводзяцца з 1977 года і ў якіх прымаюць удзел філатэлісты гарадоў Беларусі, Украіны і РСФСР, што ўваходзяць у геаграфічную зону Палесся.

Выстаўка «Палессе-87» прысвячалася 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. Гэта і вызначыла тэматыку філатэлістычных калекцый, прысланых з Мінска, Брэста, Кіева, Брянска, Смаленска, Чарнігава, Белгарада і іншых гарадоў.

Экспазіцыя расказала аб будаўніцтве новай многанацыянальнай дзяржавы, перамозе савецкага народа над фашызмам.

Многія філатэлісты прысвяцілі свае калекцыі роднаму краю. Мінчанін А. Разанаў назваў сваю калекцыю «Беларусь Савецкая». Моваю паштовых марак, канвертаў, спецыяльных штэмпеляў у ёй расказваецца аб нараджэнні ў агні грамадзянскай вайны Савецкай Беларусі, аб яе дасягненнях у прамысловасці, культуры, сельскай гаспадарцы. Журы прысудзіла А. Разанаву сярэбраны медаль выстаўкі.

Вялікі сярэбраны медаль атрымала цікавая работа філатэліста з Брэста Б. Сярко. У калекцыі паказаны першыя крокі Краіны Саветаў.

«Ф. Э. Дзяржынскі — жыццё і дзейнасць»— так назваў сваю калекцыю філатэліст са Смаленска Э. Кулянцаў. Яна адлюстравала ўсе этапы жыцця «рыцара рэвалюцыі». Сярэбраны м...даль—узнагарода за працу калекцыянера.

Х... ца адзначыць яшчэ дзве цікавыя калекцыі. «Вялікі Пра... ...тэй рэвалюцыі» — тэматычная распрацоўка магіляўчаніна Я. Грынёва. Яна прысвечана жыццю і дзейнасці К. Маркса, яго вучэнню, уздзеянню марксізму на грамадскае развіццё. Як ... працягам гэтага своеасаблівага філатэлістычнага расказу пра вялікіх людзей эпохі служыць калекцыя таксама магіляўчаніна А. Гурэвіча, прысвечаная У. І. Леніну.

У ...пазіцыі было прадстаўлена больш за 30 калекцый з 15 ...доў. Да адкрыцця выстаўкі Міністэрства сувязі выпусціла спецыяльны канверт, у дні яе работы на паштамце Магілёва прымянялася спецыяльнае гашэнне карэспандэнцыі.

Беларускае рэспубліканскае аддзяленне Усесаюзнага таварыства філатэлістаў звярнулася з просьбай у Праўленне Усесаюзнага таварыства філатэліі правесці чарговую філатэлістычную выстаўку «Савецкае Палессе-88» у сталіцы БССР горадзе-героі Мінску. Выстаўка будзе прысвечана 70-годдзю ўтварэння БССР.

Леў КОЛАСАЎ.

СПОРТ

Вось і завяршыўся шахматны марафон у Севільі. Чэмпіён свету Гары Каспараў у барацьбе з Анатолем Карпавым змог адстаяць свой тытул. Але для гэтага спатрэбілася згуляць усе 24 партыі. Канчатковы лік сустрэчы нічыйны — 12:12.

Кароткія паведамленні аб выступленнях беларускіх спартсменаў.

У складзе зборнай Савецкага Саюза пяцёра гандбалістаў мінскага СКА — Шаўцоў, Тучкін, Маліноўскі, Шаравараў і Майстрэнка — гулялі ў міжнародным турніры на прызы газеты «Заря Востока». Беларускія спартсмены ўзнагароджаны залатымі медалямі за камандную перамогу.

А вось гандбалісты юніёрскай зборнай нашай краіны, за якую выступалі мінчане Якімовіч і Руткевіч, на чэмпіянаце свету ў Бялградзе занялі трэцяе месца.

Зноў парадавала Марына Лобач. На міжнародных спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы ў Хельсінкі яна перамагла ў мнагаборʼі і атрымала чатыры вышэйшыя балы ва ўсіх асобных практыкаваннях.

Валейбалісткі мінскага «Камунальніка» двойчы з аднолькавым лікам — 3:0 перамаглі бельгійскі клуб «Антоніус» і выйшлі ў паўфінал Кубка уладальнікаў еўрапейскіх краін. Цяпер яны сустрэнуцца з чэхаславацкай «Славіяй».

У ЗВЯРОЎ ПЕРАМЕНЫ...

У гэтую пару года лясныя насельнікі рэзка мяняюць свой лад жыцця. Заяц-бяляк стаў зусім беленькі. Толькі вось кончыкі вушэй ды хвосцік у яго чорныя. Надыдзе ноч — падымецца бяляк з лежні, пагрызе асінавай кары ды тонкіх галіначак, выскачыць на дарогу паласавацца пахучым сенам, якое дзе-нідзе згубіў сялянскі воз, паскача, пабегае і зноў увесь дзень сядзіць ціха, толькі вачамі па баках косіць — ці не падкрадваецца хто.

А заяц-русак перабраўся бліжэй да жылля чалавека — тут прасцей здабываць корм: то пагрызе на гародзе рэшткі капусты, то наесца ўдосталь каля вялікай калгаснай сцірты...

Надзвычай прыгожай стала ліса. Уся агніста-рыжая, з бліскучай поўсцю, толькі жывот ды ніжняя частка шыі белыя. Віхляючы з боку ў бок пушыстым хвастом, носіцца яна па полі, раз-пораз тыцкаючыся пысай у маленькія, таўшчынёй з вялікі палец, норкі — мышкуе.

Прыкметна менш у лесе птушак. Але птушыныя галасы чуюцца. Пасвістае на маладой асіне вялікая сініца, выстуквае, як на барабане, дзяцел, трашчаць балбатлівыя сарокі.

А вось з'явіліся і нашы зімнія госці — амялушкі. Ярка-ружовыя, з чырвоным і жоўтым пер'ем у крылах і чубам на галаве.

Падбадзёраючы адзін аднаго сваімі звонкімі галасамі, ласуюцца яны янтарнымі гронкамі рабіны. А побач з імі — чырванагрудыя снегіры.

В. СТОМА.

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1857.